**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДзУК “Лунінецкая РЦБС” у ліпені 2026 года**

**3 ліпеня 2026 года** ў Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь у бібліятэках ДУК «Лунінецкая РЦБС» прайшлі наступныя мерапрыемствы.

Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Н. Калінковіча і Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі прынялі ўдзел у шэсці працоўных калектываў. Бібліятэкарамі **Цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Калінковіча,** каля помніка Якубу Коласу, была арганізавана інтэрактыўная бібліятэчная пляцоўка «Квітней, Беларусь Незалежная!». На бібліятэчнай пляцоўцы была афармлена кніжная выстава «Беларусь мая, сінявокая!». Для прысутных прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Квітней, мая Беларусь!», з удзелам членаў народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция».

Для самых маленькіх гасцей работнікі **філіяла Цэнтральная дзіцячая бібліятэка** арганізавалі інтэлектуальна-гульнявую праграму «Услаўляю цябе, край любімы!». Дзеці з задавальненнем складалі пазлы з выявай беларускіх славутасцяў і спаборнічалі ў віктарыне «Моя Беларусь…».

У **філіяле Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** ў рамках мэтавай праграмы «Пусть доброты прибавиться на свете» для ўдзельнікаў клуба маладых інвалідаў «САМИ» прайшла краязнаўчая праграма «Мне по сердцу милая Родина, мне по сердцу мой любимый край». Бібліятэкар Лілія Баган расказала пра гісторыю свята, пра галоўныя сімвалы нашай краіны. Далей удзельнікі мерапрыемства чыталі вершы, прысвечаныя Беларусі і беларусам, прынялі ўдзел у віктарыне «Города Беларуси». Вялікую цікавасць выклікалі конкурсы «Родина» і «Моя Беларусь».

У **філіяле Лунінская сельская бібліятэка** прайшоў гістарычны экскурс «По следам истории: шифры и символы Беларуси». Бібліятэкары расказалі дзецям гісторыю ўзнікнення і святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Удзельнікі мерапрыемства актыўна ўдзельнічалі ў віктарынах і гульнях. Завяршылася мерапрыемства аглядам кніжнай выставы «Квітней пад сонцам, Беларусь».

У **філіяле Рэдзігераўская сельская бібліятэка** прайшла тэматычная гутарка «Квітней, Беларусь!».

Культарганізатар **філіяла Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** правяла віктарыну «Шаную цябе, Беларусь». Дзеці адказвалі на пытанні міні-віктарыны «Моя Беларусь» аб знакавых гістарычных і прыродных аб'ектах Беларусі, устаўлялі прапушчаныя словы ў тэксце гімна Беларусі, выконвалі заданні «Продолжи пословицу», «Переведи на белорусский язык» і інш.

У **філіяле Сінкевіцкая сельская бібліятэка** прайшло краязнаўчае падарожжа «Моя Беларусь». Бібліятэкар распавяла аб ходзе беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Багратион», праведзенай савецкімі войскамі з 23 чэрвеня па 29 жніўня 1944 года.

**Філіял Бастынская сельская бібліятэка** - тэматычны час «Славілі цябе не раз паэты».

**Філіял Дзятлавіцкая сельская бібліятэка** - літаратурная гасцёўня «Беларусь в сердце, память в книгах».

**Філіял Баравецкая сельская бібліятэка** - паэтычны час «О Беларусь, мая калыска».

**Філіял Лахвенская сельская бібліятэка** - агляд кніжнай выставы «Красуйся пад сонцам Беларусь».

**Філіял Багданаўская сельская бібліятэка** - гістарычны ўрок «Горжусь тобой, земля Родная».

Вялікая ўвага бібліятэкамі сістэмы надаецца захаванню народных традыцый і звычаяў, і далучэнню да іх дзяцей. **7 ліпеня** святкавалася народнае свята Купалле. У бібліятэках раёна адбыўся шэраг мерапрыемстваў.

У **філіяле Бастынская сельская бібліятэка** прайшоў тэматычны вечар «Традиции хранить и умножать». Дзеці прынялі ўдзел у віктарыне аб летніх з'явах прыроды і раслінах «Угадай-ка».

У **філіяле Рэдзігераўская сельская бібліятэка** прайшоў майстар-клас «В поисках цветка папоротника». Удзельнікі мерапрыемства спаборнічалі на лепшае пляценне вянкоў.

У **філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** праведзены пазнавальны час «Таинство ночки Купальской».

У **філіяле Лунінская сельская бібліятэка** адбылася фальклорная гадзіна «Праздник Ивана Купала: история, традиции и обычаи». Дзеці з цікавасцю слухалі пра старадаўнія абрады, удзельнічалі ў віктарыне і адгадвалі загадкі. Завяршылася мерапрыемства пляценнем вянкоў.

У **філіяле Дзятлавіцкая сельская бібліятэка** прайшла краязнаўчая гадзіна «Традиции наших предков на Иванов день».

У **філіяле Вялікачучавіцкая сельская бібліятэка** праведзена літаратурна-гульнявая праграма «Ясная ночка купальская».

Бібліятэкар **філіяла Лахвенская сельская бібліятэка** арганізавала і правяла конкурсна-забаўляльную праграму «Купалье – традиции и обычаи».

**10 ліпеня 2026 года бібліятэкі ДУК «Лунінецкая РЦБС»** прынялі ўдзел у мерапрыемстве, прымеркаваным да Дня горада і 82-й гадавіны вызвалення Лунінецкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Для наведвальнікаў працавала інтэрактыўная бібліпляцоўка. Для гасцей і жыхароў горада былі аформлены тэматычныя кніжныя выставы: «Лунінец: учора, сёння, заўтра», дзе можна было азнаёміцца з этапамі развіцця горада, «Лунінеччына літаратурная» – пра пісьменнікаў і паэтаў, якімі багатая наша зямля. Асаблівай папулярнасцю карысталася тэматычная экспазіцыя «Брэнды Лунинеччыны», якая дэманструе галоўныя дасягненні, традыцыі і эканамічны патэнцыял нашага краю. Тут былі прадстаўлены ілюстраваныя энцыклапедыі, гістарычныя нарысы і фотаальбомы пра самыя вядомыя прадпрыемствы, культурныя аб'екты і ўнікальныя сімвалы рэгіёна.

**Філіял Цэнтральная дзіцячая бібліятэка** прадставіла кніжную выставу дзіцячай літаратуры «Край мой – Белая Русь» і інфармацыйны стэнд «Детская библиотека сегодня». Таксама для самых юных гараджан была арганізавана

бібліяпалянка «Читай, играй, наш город поздравляй». Дзеці і дарослыя прымалі актыўны ўдзел у гульнях, конкурсах і турнірах.

**14 ліпеня ў філіяле Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** прайшла літаратурная гадзіна «У госці да Алаізы», прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння першай беларускай пісьменніцы-жанчыны Алаізы Пашкевіч, больш вядомай як Цётка. Вядучая мерапрыемства, бібліятэкар Марыя Хатынюк, расказала ўдзельнікам мерапрыемства пра неверагодныя факты жыцця Алаізы Пашкевіч, пра цяжкасці, якія чакалі яе на жыццёвым шляху. Удзельнікі мерапрыемства чыталі вершы пісьменніцы.

**16 ліпеня ў чытальнай зале Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Калінковіча** адбыўся творчы вечар «В поэзии – судьба и жизнь моя», прысвечаны юбілею ўдзельніцы народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция» Людмілы Іванаўны Бабіч. Сабраліся сябры, калегі па перу і ўсе тыя, хто шчыра любіць творчасць Людмілы Іванаўны. Калегі па студыі падрыхтавалі для юбіляркі нямала сюрпрызаў: гучалі аўтарскія вершы і любімыя песні. Асаблівай часткай праграмы стала інтэрв'ю, якое правёў кіраўнік «Литературной провинции» Віктар Андрэевіч Пінігін. У фармаце жывога, давернага дыялогу Людміла Іванаўна падзялілася сваімі творчымі планамі.

**19 ліпеня 2026 года ў філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** адбыўся майстар-клас па вязанні снапоў «Урожайный сноп». У ходзе мерапрыемства мясцовыя жыхаркі паказалі юным удзельнікам мерапрыемства тэхніку ручной вязкі «зажиночного» снапа з выкарыстаннем сярпа і саламяных жгутоў.

**У філіяле Мікашэвіцкая гарадская бібліятэка** ў рамках праграмы летняга чытання прайшоў цыкл пазнавальных мерапрыемстваў, на якіх дзяцей навучалі правілам бяспечных паводзін у перыяд летніх канікул. Адбылася прафілактычная гутарка «Что ты знаешь о воде?». Весела і займальна прайшоў інтэлектуальны турнір «Палитра безопасности». Дзеці ў гульнявой форме праверылі свае веды аб правілах дарожнага руху і пажарнай бяспекі. Таксама прайшла тэматычная гульня «Пожарная безопасность». Як бяспечна пераходзіць дарогу, што азначаюць сігналы святлафора і якія бываюць дарожныя знакі дзецям распавялі падчас урока бяспекі «Дорожный калейдоскоп». Затым дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах і гульнях, адказвалі на пытанні віктарыны «Умный пешеход» і адгадвалі загадкі аб транспарце і дарожным руху. Гульні, віктарыны, гутаркі і ўрокі дапамаглі дзецям правесці час весела і з карысцю.

**24 ліпеня ў Лунінецкай Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Калінковіча** адбылася вечарына памяці, прысвечаная 36-й гадавіне з дня трагічнай гібелі пісьменніка Мікалая Калінковіча, чыё імя носіць бібліятэка. Вядомы нам як журналіст, падпалкоўнік дзяржбяспекі, пісьменнік і першы даследчык, які паставіў гісторыю Лунінеччыны на сур'ёзную навуковую аснову. Яго кнігі вярнулі памяць аб забытых святынях, дарогах вайны і лёсах вялікіх людзей, чые шляхі перасякаліся з Палессем. У гэты дзень у зале

сабраліся ўсе тыя, хто памятае пісьменніка, хто шануе яго памяць: прадстаўнікі дзяржаўных органаў і грамадскасці, літаратары, краязнаўцы Лунінеччыны і бібліятэкары. Сярод іх: начальнік Лунінецкага міжраённага аддзела Камітэта дзяржаўнай бяспекі Яўген Сяргеевіч Ліра, благачынны Лунінецкай царкоўнай акругі, настаяцель прыхода храма іконы Божай Маці «Взыскание погибших» (г. Лунінец) протаіерэй Сергій Крышталь, дырэктар ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Ірына Аляксандраўна Лецка, былы дырэктар краязнаўчага музея, сярэдняй школы № 4 г. Лунінца Наталля Іванаўна Казанкова, краязнаўца і даследчык Лунінеччыны Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч, удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция». У завяршэнне мерапрыемства ўсклалі кветкі да помніка пісьменніку Мікалаю Калінкавічу. *(Лунінецкія навіны. 2026. 29 ліпеня. С. 5).*

Летнія канікулы працягваюцца, а супрацоўнікі бібліятэк ДУК «Лунінецкая РЦБС» працягваюць дарыць дзецям яркія эмоцыі і карысныя веды.

У **філіяле Цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэка** праведзена гульнявая праграма «Загадки на библиотечном лугу». Разгадваючы загадкі, дзеці ўспаміналі сюжэты казак, даведваліся любімых персанажаў, знаёміліся з новымі героямі, адказвалі на пытанні віктарыны, складалі пазлы і гулялі ў настольныя гульні.

На гадзіну дзіцячай творчасці «Акварельная поляна» ў **філіяле Цэнтральная дзіцячая бібліятэка** сабраліся дзеці з розных куткоў Зямлі: г. Мурманска, г. Ліда, г. Мінска, а таксама навучэнцы СШ №1, СШ №2 і СШ №4 г. Лунінца. Падчас мерапрыемства бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з кніжнымі навінкамі, прапанавалі вялікую разнастайнасць дзіцячых часопісаў. Удзельнікі мерапрыемства чыталі на памяць вершы. Таксама супрацоўнікамі дзіцячай бібліятэкі была падрыхтавана і праведзена гульнявая праграма «Лето на календаре». Тут былі вясёлыя конкурсы, інтэлектуальныя і настольныя гульні, пазнавальныя віктарыны. Усе жадаючыя змаглі згуляць у гульню «Литературное домино», а знаўцы загадак праверылі сябе ў бяспройгрышнай латарэі «Отгадай загадку!».

**23 ліпеня** ў дзіцячай бібліятэцы адбыўся Дзень адчыненых дзвярэй «Рады мы всегда друзьям, приглашаем в гости к нам». Усіх наведвальнікаў бібліятэкі чакалі кніжныя выставы «Открываем мир вместе», «У книжек нет каникул», «Новые книги». Літаратурная гульня «Сказки мира.

Таксама ў бібліятэках сістэмы былі арганізаваны літаратурныя падарожжы, вясёлыя віктарыны, забаўляльныя праграмы рознай накіраванасці.

У **філіяле Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** прайшоў конкурс дзіцячых малюнкаў «Краски рисуют сказки». Таксама ў бібліятэцы-клубе для дзяцей прайшоў літаратурны рынг «В мире сказок, чудес и волшебства». Разам з бібліятэкарам дзеці здзейснілі займальнае падарожжа па кніжнай выставе «Лето — время читать».

У **філіяле Лунінская сельская бібліятэка** была праведзена літаратурная гадзіна «Любимые герои книг». На тэму дружбы прайшоў тэматычны ўрок «Если с другом вышел в путь».

У **філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** для дзяцей прайшла гульнявая праграма «Час весёлых затей», падчас якой было праведзена шмат цікавых конкурсаў, гульняў і жартоўная віктарына. А да 90-годдзя з дня выхаду аповесці-казкі «Золотой ключик, или Приключение Буратино» адбылася пазнавальная гутарка.

Супрацоўнікі **філіяла Бастынская сельская бібліятэка** правялі гульню-віктарыну «Большая литература для маленьких».

У **філіяле Лахвенская сельская бібліятэка** для дзяцей правялі займальнае падарожжа па чароўным свеце казак «В гостях у сказки».

У **філіяле Сінкевіцкая бібліятэка** праведзены мастацкі рынг для дзяцей «Рисуем лето», праведзены агляд кніжнай літаратуры «Женщины, прославившие Беларусь», прымеркаванай да Года беларускай жанчыны.

Бібліятэкар **філіяла Лунінецкая гарадская бібліятэка** мікрараёна «Сельгастэхніка» правяла пазнавальную гадзіну «Вам журналы хотят рассказать…».

У **філіяле Багданаўская сельская бібліятэка** прайшло літаратурнае падарожжа «Моя любимая сказка А. Афанасьева».

**Бібліятэкар філіяла Міжлеская сельская бібліятэка** правяла літаратурна-гульнявую праграму «Книги мы читаем, мастером, играем». Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў віктарынах, конкурсах, гулялі ў гульні на спрыт, рухомасць, уважлівасць, спявалі дзіцячыя песні, глядзелі мультфільм «Простоквашино».

У **філіяле Дзятлавіцкая сельская бібліятэка** прайшла гадзіна экалогіі «Что в лесу растет, кто в лесу живет?».

Для арганізацыі карыснага вольнага часу дзяцей у бібліятэках рэгулярна праводзяцца турніры і спаборніцтвы.

У **філіяле Багданаўская сельская бібліятэка** прайшоў шашачны турнір «Чемпионы» сярод чытачоў розных узростаў. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

У **філіяле Бродніцкая сельская бібліятэка-клуб** прайшоў тэнісны турнір» «Теннисный марафон».

**25 ліпеня 2026 года** ў вёсцы Люшча прайшло свята вёскі «Родные места». Сёлета вёска адзначыла свой 121 год нараджэння. У якасці ганаровых гасцей на мерапрыемстве прысутнічалі: старшыня Бастынскага сельвыканкама Аляксандр Сцяпанавіч Зылевіч, старшыня СТАА «БСВВА», дэпутат Лунінецкага раённага Савета дэпутатаў Мікалай Мікалаевіч Кавалёў, памочнік благачыннага па грамадскіх сувязях протаіерэй Ян Пятрэнка і інструктар-метадыст Лунінецкага ГАС ДТСААФ Алена Сяргееўна Пятрэнка.

Жыхароў вёскі сваёй творчасцю парадавалі салісты і калектывы філіяла Люшчанская сельская бібліятэка-клуб сумесна з работнікамі Малькавіцкага сельскага клуба, былі арганізаваны выставы дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва. Для дзяцей была арганізавана работа гульнявой пляцоўкі з гульнявымі атракцыёнамі.